УДК 94:322(47+57)"192":32.019.5-053.2

**Н. І. Казлова**
Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

# КАМПАНІЯ ПА КАНФІСКАЦЫІ ЦАРКОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У РСФСР У 1922 ГОДЗЕ

*Артыкул прысвечаны кампаніі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей у савецкай дзяржаве ў 1922 г., якая стала адной з буйнейшых антырэлігійных акцый савецкага ўрада ў дачыненні Рускай Праваслаўнай Царквы. На працягу доўгага часу гісторыя разглядаемай трагедыі была вядома толькі ў агульных рысах і большай часткай у наўмысна скажоным выглядзе. Аўтар артыкула прыходзіць да высновы, што кампанія не дасягнула пастаўленых Палітбюро ЦК РКП(б) мэт. Удар, нанесены ў 1922 г. уладамі, паслабіў царкву, але яна змагла захаваць свае арганізацыйныя структуры, выстаяць перад небяспекай расколу і не была знішчана цалкам, хоць некаторая частка веруючых і адышла ад царквы.*

Руская Праваслаўная Царква (РПЦ) за сваю доўгую гісторыю перажыла розныя перыяды. Адным з самых трагічных у яе гісторыі з'яўляецца першае савецкае дзесяцігоддзе, калі царква была пазбаўлена юрыдычных правоў, храмы і іншыя будынкі, прызначаныя для набажэнства, зачыняліся, прадстаўнікі духавенства падвяргаліся рэпрэсіям. Гісторыкі выдзяляюць дзве савецкія антыцаркоўныя кампаніі, якія мелі асаблівае значэнне ў лёсе РПЦ. Гэта кампанія па ўскрыцці святых мошчаў (1918–1920 гг.), і кампанія па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей 1922 г. З другой паловы 1921 г. да сярэдзіны 1922 г. многія раёны савецкай краіны былі ахоплены страшным голадам, ад якога загінула больш за 5 млн. чалавек. Побач з такой традыцыйнай прычынай голаду як засуха, ён быў выклікаты спусташэннем вёскі у выніку грамадзянскай вайны і эканамічнымі эксперыментамі бальшавікоў у выглядзе «ваеннага камунізму» [1].

У ліпені 1921 г. дзеля змагання з голадам на дзяржаўным узроўні была створана Цэнтральная камісія дапамогі галадаючым пры УЦВК (ЦК «Помгол») пад старшынствам М. І. Калініна [2]. Акрамя таго, Руская Праваслаўная Царква адразу ж адгукнулася на народнае бедства. У жніўні 1921 г. патрыярх Ціхан заснаваў Усерасійскі царкоўны камітэт дапамогі галадаючым і звярнуўся з Вазваннем «Да

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

народаў міру і праваслаўнага чалавека», у якім прасіў дапамагчы краіне, «якая карміла многіх і цяпер памірае з голаду». Царквой за кароткі тэрмін былі сабраны значныя сродкі для дапамогі галадаючым [5]. Аднак у ЦК РКП(б), Саўнаркаме і іншых ведамствах уплывовыя службовыя асобы – Л. Д. Троцкі, Г. Е. Зіноўеў, Е. Яраслаўскі, П. А. Красікаў, М. І. Бухарын і некаторыя іншыя – сталі рэзка выступаць супраць удзелу царквы ў аказанні дапамогі галадаючым, спасылаючыся на інструкцыю НКЮ ад 30 жніўня 1918 г., згодна якой рэлігійным арганізацыям забаранялася займацца дабрачыннай дзейнасцю [1]. Але ўсё ж такі 8 снежня УЦВК прымае пастанаўленне, якое дазваляла рэлігійным арганізацыям ажыццяўляць збор сродкаў для аказання дапамогі галадаючым [5].

6 (19) лютага 1922 г. ў царкоўна-прыхадскія абшчыны паступіў патрыяршы дазвол ахвяраваць на патрэбы галадаючым каштоўныя царкоўныя ўпрыгожванні і прадметы, якія не выкарыстоўваліся ў богаслужэбным працэсе. Заклік патрыярха знайшоў водгук сярод архірэяў. Так, напрыклад, мітрапаліт Петраградскі Веніямін (Казанскі) быў гатовы зняць каштоўны аклад з Казанскага абраза Божай Маці (галоўнай святыні Петраграду), калі гэта дапамагло б выратаваць жыццё некалькім галадаючым [4, с. 68]. На працягу 1922 г. практычна па ўсей дзяржаве царкоўнаслужачыя звярталіся да вернікаў з прызывамі аб дапамозе галадаючым. Так, са звароту да вернікаў Рэчыцкага павета: «Цяпер ахоплена голадам 25 млн. рускага народу. Людзі гінуць і паміраюць. Распаўсюджваюцца эпідэміі. Голад даводзіць павалжан да таго, што яны нават ядуць памерлых. Выкопваюць трупы з магіл. І кожны кавалак чалавечыны ляжа на сумленне тых, хто не дапаможа галодным… Наша заданне ўсімі сіламі правесці ў жыццё закон аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей» [8, арк. 68].

Набіраючы сілу праваслаўны рух дапамогі галадаючым не ўваходзіў у палітычныя планы ўлады. Так, дзяржаўныя дзеячы працягвалі ствараць перашкоды рабоце царкоўных камітэтаў. Напрыклад у Самарскай губерні 25 снежня 1921 г. былі арыштаваны члены епархіяльнага камітэта дапамогі галадаючым за іх «незаконную дзейнасць» і асуджаны ўсе, уключаючы епархіяльнага архірэя епіскапа Паўла, на тэрмін ад аднаго да двух гадоў за «контррэвалюцыйную дзейнасць». Быў зачынены Усерасійскі камітэт дапамогі галадаючым, сабраныя ім сродкі рэквізаваны. Такім чынам, царква была пазбаўлена ініцыятывы і ўдзелу ў гэтай справе [3, с. 109].

Разгарнулася падрыхтоўка да кампаніі па масавай канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей. Так, 23 лютага 1922 г. была апублікавана



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пастанова УЦВК, у якім паведамлялася месным саветам: «У месячны тэрмін са дня апублікавання гэтай пастановы канфіскаваць з царкоўных маёмасцей, перададзеных у карыстанне групам вернікаў усіх рэлігій па вопісах і дагаворах, усе каштоўныя прадметы з золата, срэбра і камянёў, канфіскацыя якіх не можа істотна закрануць інтарэсы самога культу, і перадаць іх у органы Народнага Камісарыята Фінансаў са спецыяльным назначэннем у фонд Цэнтральнай камісіі дапамогі галадаючым» [7]. Нягледзячы на тое, што ў пастанове была зроблена рэмарка на тое, што канфіскаваць можна толькі прадметы, якія не закранаюць інтарэсы культу, на самой справе размова ішла аб канфіскацыі ўсіх каштоўнасцей без усялякага разбору. Прычына такіх паводзін урада заключалася ў самой сутнасці атэістычнай улады: ёй не патрэбен быў дыялог з царквой, а трэба было поўнае яе знішчэнне. Такая была пазіцыя амаль усяго вышэйшага партыйнага кіраўніцтва. Дадзеная пастанова мела сваёй мэтай прымусіць вернікаў пачаць супраціўленне царкве.

Супраць дадзенага мерапрыемства, па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей, выступіў патрыярх Ціхан. Ён разглядаў гэтую пастанову як імкненне скампраметаваць царкву ў вачах насельніцтва. Так, 28 лютага 1922 г. ён звярнуўся да веруючых з вазваннем, у якім падвергнуў асуджэнню палітыку ўмяшання УЦВК у справы царквы. Патрыярх Ціхан казаў: «нас абвінавачваюць у «сквапнасці да золата». Але пры чым тут сквапнасць, калі мы ў поўнай недатыкальнасці захоўваем з глыбіні стагоддзяў царкоўныя каштоўнасці, якія маюць значэнне святыні або гістарычную знакавасць, і хочам зберагчы іх да будучых стагоддзяў, і, наадварот, усё, што не мае такога значэння мы аддаём на дапамогу галадаючым, як тое, якое мае каштоўнасць толькі па матэрыяльнаму кошту». Таксама Патрыярх выказаў пратэст супраць таго, што ўрад прымушае здзяйсняць кананічныя злачынствы, бо каноны забараняюць выкарыстанне набажэнскіх прадметаў не для святых мэт [3, с. 115].

Нягледзячы на жаданне ўлады справакаваць сутыкненне з Царквой, першы перыяд кампаніі па канфіскацыі каштоўнасцей прайшоў спакойна. Па сведчанні мясцовых улад, духавенства рабіла ўсё, каб унікаць канфліктаў. Аднак самі ўлады сваімі дзеяннямі справакавалі шэраг сутыкненняў, самым сур’ёзным з якіх быў інцыдэнт у г. Шуі Іванава-Вазнясенскай губерні, дзе 15 сакавіка 1922 г. салдаты расстралялі бяззбройны натоўп, што стыхійна спрабаваў перашкодзіць працэсу канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей, які праводзіўся вельмі абуральна. Загінула 5 чалавек. Сутыкненні народа з уладамі адбыліся і ў шэрагу іншых месцаў [4, с. 71].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пад час кампаніі праводзілася моцная агітацыйная антырэлігійная праца, якая знаходзілася пад кантролем партыі. Вялікую ўвагу пытанням антырэлігійнай прапаганды надаваў Л. Д. Троцкі. Ён адзначаў, што неабходна праводзіць самую элементарную агітацыю і прапаганду па самым простым пытанням. «Па пытанню канфіскацыі каштоўнасцей, аб паводзінах папоў і інш. патрэбны караценькія пракламацыі ў колькасці 100–200 тысяч кожная. Замест гэтага мы займаемся выдавецтвам у Маскве некалькіх палітычных газет…» [2].

Так, 10 сакавіка 1922 г. Камісіяй па ўліку і прыняццю каштоўнасцей была прынята пастанова, якая патрабавала:

«8. Распрацаваць некалькі плакатаў, на якіх, з аднаго боку, былі б выявы жудасцяў голаду, трупаў дзяцей і др. (лепей за ўсё фотаздымкі), а з іншага боку, быў бы прыведзены зварот патрыярха Ціхана…а таксама мітрапаліта Веніяміна.

9. У агітацыі неабходна пазбягаць здзекавання, жартаў, насмешлівых вершаў і іншага, а прытрымлівацца сур'ёзнага тону агітацыі, разлічанага на тое, каб выклікаць суперажыванне да галадаючых волжскіх сялян, і паказаць жорсткасць князёў праваслаўнай царквы» [6].

Так, у сувязі з канфіскацыяй каштоўнасцей былі выдадзены брашуры М. Горава «Засуха», брашура ад імя Галоўнага палітыка-асветніцкага камітэту «Матэрыялы для агітацыі аб пытанні па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей для галадаючых» [10, с. 89]. Вялікую ролю ў антырэлігійнай прапагандзе пад час кампаніі адыгрываў плакат. Так, у першую чаргу варта адзначыць працы Д. Маора, М. Чарамных і Ф. Мельнікава («Дапамажы!», «Багатырскі бой», «Трэба дапамагчы галадаючай Волзе…», «Дзесяць сытых накормяць аднаго галоднага», «Ратуйце нас», «Царкоўныя каштоўнасці галодным» і т. д.). Агульны тыраж плакатаў склаў не менш за 500 000 тысяч экзэмпляраў [10, с. 83].

Савецкая ўлада атрымала доўгачаканую нагоду, каб распачаць перыяд новых праследванняў супраць РПЦ. Пачатак арганізаваных праследаванняў паклаў ліст Троцкага ў Палітбюро ад 17 сакавіка 1922 г., у якім ён выступіў з прапановамі аб парадку канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей. Троцкі прапанаваў стварыць сакрэтныя камісіі па падрыхтоўцы збору каштоўнасцей, правесці інтэнсіўную агітацыю ў народзе, звінаваціць духавенства ў нежаданні аддаваць каштоўнасці. Пры гэтым для ўлады «вельмі пажаданы канфлікты з вернікамі, каб разграміць кожны супраціў і дыскрэдытаваць царкву ў вачах народа» [3, с. 158].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У. Ленін падтрымаў ініцыятыву Л. Троцкага. Так, 19 сакавіка 1922 г. ён накіраваў у Палітбюро свой знакаміты ліст з нагоды Шуйскіх падзей, у якім паказаны планы бальшавікоў на конт ліквідацыі Царквы. Ленін пісаў: «Менавіта цяпер, калі ў галодных мясцовасцях на дарогах валяюцца сотні, калі не тысячы трупаў, мы можам правесці канфіскацыю царкоўных каштоўнасцей з самай шалёнай энергіяй… не спыняючыся перад якім-небудзь супраціўленнем. Менавіта зараз і толькі зараз велічэзная большасць сялян будзе або за нас, або не будзе падтрымваць жменьку чарнасоценнага духавенства… мы павінны здушыць яго (духавенства) супраціўленне з такой жорсткасцю, каб яны не забыліся пра гэта напрацягу некалькіх дзясяткаў гадоў… Чым больш прадстаўнікоў рэакцыйнага духавенства і буржуазіі атрымаецца нам па гэтай нагодзе расстраляць, тым лепш». За Патрыярхам Ленін прапанаваў усталяваць строгі нагляд [9]. З гэтага дакумента вынікае, што мэтай кампаніі быў зусім не клопат аб галадаючых, а нанясенне РПЦ магутнага ўдару, нейтралізацыя яе аўтарытэту.

Так, з вясны 1922 г. у дзеяннях улад сталі пераважаць карныя метады. У красавіку – маі прайшоў вядомы працэс над духавенствам у Маскве. Адзінаццаць чалавек прысудзілі да расстрэлу (шэсць памілавалі, асцерагаючыся грамадскай думкі Захаду). Патрыярх Ціхан, спачатку на дадзены працэс быў закліканы як сведка, але ў ходзе справы, быў прыцягнуты да суда як абвінавачаны і паспешна арыштаваны. Так, 19 мая 1922 г. яго перавезлі з Троіцкага падворка, дзе ён утрымваўся пад хатнім арыштам, у Данскі манастыр, дзе ён знаходзіўся ўвесь наступны час у поўнай ізаляцыі ад навакольнага свету. Партыярха хацелі расстраляць, але бальшавіцкае кіраўніцтва ад дадзенага мерапрыемства спыняла толькі нежаданне выклікаць абурэнне грамадскай думкі на Захадзе. Так, напрыклад, Вялікабрытанія заявіла, што калі суд над Патрыярхам пачнецца, то яна адкліча з Савецкай Расіі сваіх дыпламатычных прадстаўнікоў [2]. Ціхан быў памілаваны толькі пасля заявы пра тое, што ён «раскайваецца ў правінах супраць дзяржаўнага ладу». Адбылося гэта ў чэрвені 1923 г.

Такім чынам, кампанія па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей 1922 г. з’явілася моцнай антырэлігійнай кампаніяй, скіраванай на ліквідацыю царквы, знішчэнне духавенства і выцясненне рэлігіі з грамадскай свядомасці. Пад лозунгамі выратавання галадаючых партыя накапляла ўласны капітал. Карныя метады правядзення кампаніі, галоўным прыхільнікам якіх быў Л. Д.Троцкі, ператварылі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кампанію ў бітву, у якой дзякуючы вайсковай перавазе бальшавікі здабылі верх над стыхійным пратэстам насельніцтва.

Але праведзеная цаной неймаверных намаганняў, кампанія не дасягнула пастаўленых Палітбюро ЦК РКП(б) мэт. Улады не атрымалі жаданай колькасці золата. Сабраныя каштоўнасці склалі толькі нязначную частку ад тых, на якія разлічваў Л. Д.Троцкі. Вялікая частка канфіскаванага была патрачаная на правядзенне самой кампаніі, пайшла на забеспячэнне партыйнага і савецкага апарата і беззваротна знікла за мяжой. Удар, нанесены ў 1922 г. уладамі, паслабіў царкву. Пагроза фізічнай расправы навісла над духавенствам. Але царква змагла захаваць свае арганізацыйныя структуры, выстаяць перад небяспекай расколу і не была знішчана цалкам.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Губкин, О. В. Русская Православная Церковь под игом богоборческой власти в период с 1917 по 1941 годы [Электронный ресурс] / О. В. Губкин. – СПб, 2006. – Режим доступа: http://providenie.narod.ru/0363.html. – Дата доступа: 07.10.2016.

2. Кривова, Н. А. Власть и Церковь в 1922–1925 гг.: Политбюро и ГПУ в борьбе за церковные ценности и политическое подчинение духовенства [Электронный ресурс] / Н.А. Кривова. – М., 1997. – Режим доступа: http://krotov.info/history/20/krivova/kriv01.html. – Дата доступа: 07.10.2016.

3. Алексеев, В. А. Иллюзии и догмы / В. А. Алексеев. – М.: Политиздат, 1991. – 400 с.

4. Поспеловский, Д. В. Русская православная церковь в XX веке / Д. В. Поспеловский. – М.: Республика, 1995. – 511 с.

5. Русская Православная Церковь в советское время (1917–1991). Материалы и документы по истории отношений между государством и Церковью [Электронный ресурс] / Составитель Г. Штриккер. – М.: Пропилеи, 1995. – 400 с. – Режим доступа: http://www.krotov.info/acts/20/1920/shtric_04.htm. – Дата доступа: 07.10.2017.

6. Протокол № 1 совещания в ГПУ «О проведении кампании по изъятию церковных ценностей» от 10 марта 1922 г. [Электронны рэсурс] // Архивы Кремля. Кн. 1. Политбюро и церковь. 1922–1925 гг. – М.: Российская политическая энциклопедия. – Режим доступу: http://www.rus-sky.com/history/library/archvs1.htm_Toc491501082. – Дата доступу: 04. 11. 2017.

7. Постановление ВЦИК «Об изъятии церковных ценностей». 23 февраля 1922 г. [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: http://istmat.info/node/33977. – Дата доступу: 10. 11. 2017.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

8. Обращение ко всем верующим от Речицкого духовенства по Речицкому уезду // Государственный архив Гомельской области (ГАГО). – Ф. 29. – Оп. 1. – Д. 109. – Л. 68
9. Письмо В.И. Ленина членам Политбюро о событиях в г. Шуе и политике в отношении церкви / Архивы Кремля. В 2-х кн. Кн. 1. Политбюро и церковь. 1922-1925 гг. – М.-Новосибирск: «Российская политическая энциклопедия», «Сибирский хронограф», 1997. – 141 с.
10. Кандидов, Б. Голод 1921 г. и церковь / Б. Кандидов. – Москва – Ленинград: Московский рабочий, 1932. – 95 с.

УДК 271.2-9-726.1Сергий Страгородский"1927"

**С. Ф. Веремеев**
Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

## ДЕКЛАРАЦИЯ СЕРГИЯ СТРАГОРОДСКОГО (1927) И ЕЁ ЗНАЧЕНИЕ

*В данной статье рассматриваются причины появления и анализируется значение Послания заместителя патриаршего местоблюстителя митрополита Сергия Страгородского к православному духовенству и верующим 29 июля 1927 г.*

2017 год богат на юбилейные исторические даты: 500-летие белорусского книгопечатания, 500-летие Реформации, 100-летие российской революции 1917 г. и др. При этом несколько в тени осталась ещё одна знаковая дата: в июле 2017 г. исполнилось 90 лет со дня обнародования так называемой Декларации митрополита Сергия Страгородского (полное название «Послание Заместителя Патриаршего Местоблюстителя митрополита Сергия (Старогородского) и Временного при нем Патриаршего Священного Синода об отношении к советской власти») [1], ставшей отправной вехой нового этапа взаимоотношений государственных органов и православной церкви на территории СССР. Представляется актуальным рассмотреть, какие причины привели к появлению указанной Декларации, и, что ещё более важно, в чём заключалось её историческое значение.

В 20-е гг. XX в. православная Российская церковь в Советском государстве существовала в условиях жестких запретов, ограничений и прессинга со стороны властей. Согласно Декрету «Об отделении церкви

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ